**16 красавіка 2015 г. а 10-й гадзіне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Беларусі XI – пачатку XX стст.».**

Кнігазнаўчыя чытанні, якія праводзяцца з 1998 года, ужо даўно сталі адным з важнейшых мерапрыемстваў, якое гуртуе даследчыкаў і спецыялістаў розных краін, што працуюць з кніжнымі помнікамі – важнейшым складнікам культурнага і інфармацыйнага патэнцыялу нацыі, які дазваляе захаваць пераемнасць інтэлектуальнага вопыту паміж пакаленнямі.

Сёлетняя канферэнцыя стане добрым працягам існуючай традыцыі і збярэ зацікаўленых навукоўцаў з Беларусі, Венгрыі, Літвы, Польшчы, Украіны і Расіі. Кнігазнаўчыя чытанні аб’яднаюць кнігазнаўцаў, лінгвістаў, літаратуразнаўцаў, культуролагаў, гісторыкаў і філосафаў, якія прадставяць вынікі найноўшых даследаванняў па гісторыі беларускай рукапіснай і друкаванай кніжнай спадчыны XI – першай паловы XX стагоддзяў.

Значная частка дакладаў будзе прысвечана дзейнасці і спадчыне выдатнага дзеяча беларускай культуры эпохі Адраджэння – Францыску Скарыне, 525-годдзе з дня нараджэння якога мы святкуем сёлета.

Міжнародная канферэнцыя пройдзе ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па адрасе: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 116, канферэнц-зала (правы бакавы ўваход, 2-гі паверх).

**Тэл. для даведак: (+375 17) 293 27 81, 293 27 56**
**E-mail: pr@nlb.by**